УДК 378

**Дрозд Вольга Мікалаеўна**
*Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Жамчужненскі яслі-сад», аг. Жамчужны, Рэспубліка Беларусь, Drozd.Olga1988@yandex.ru*

# ВЫКАРЫСТАННЕ КАЗКАТЭРАПІІ Ў КАРЭКЦЫЙНА-РАЗВІЦЦЁВАЙ ПРАЦЫ З ДЗЕЦЬМІ ДАШКОЛЬНАГА ЎЗРОСТУ З ПАРУШЭННЯМІ МАЎЛЕННЯ

У нашым грамадстве з кожным годам павялічваецца колькасць дзяцей, якія маюць парушэнні маўлення. У будучыні яны могуць выклікаць цяжкасці зносін, што не дазволіць дзецям у поўнай меры раскрыць свае інтэлектуальныя здольнасці, ускладняць іх навучанне ў школе і далейшую сацыялізацыю. Казкатэрапія з’яўляецца адным з метадаў, які актыўна распрацоўваецца ў апошні час і ўжываецца ў карэкцыйнай працы з дзецьмі, якія маюць розныя парушэнні маўлення. У працэсе працы над казкамі адбываецца ўзбагачэнне слоўнікавага запасу, аўтаматызацыя гукаў, а таксама ўвядзенне гэтых гукаў у самастойнае маўленне. У працы над тэкстам казкі выхаванцы вучыцца пераказваць, прыдумляць, ажыццяўляць пошук адказаў на пытанні, аналізаваць тэкст, што ў сваю чаргу спрыяе развіццю звязнага маўлення.

**Ключавыя словы:** казкатэрапія; беларуская народная казка; выхаванцы.

**Drozd Olga Nikolaevna,**
*Zhemchuzhny Nursery-kindergarden, Zhemchuzhny, Belarus, Drozd.Olga1988@yandex.ru*

# THE USE OF FAIRY-TALE THERAPY IN CORRECTIONAL AND DEVELOPMENTAL WORK WITH PRESCHOOL CHILDREN WITH SPEECH DISORDERS

In our society, the number of children with speech disorders is increasing every year. In the future, they can cause difficulties in communicating with others, which will not allow children to fully develop their intellectual abilities, burden their education at school and further socialization. Fairy-tale therapy is one of the methods that has been actively developed recently and is used in correctional work with children with various speech disorders. In the process of working on fairy tales, vocabulary is enriched, sounds are automated, and these sounds are introduced into independent speech. In working on the text of the fairy tale, students learn to retell, invent, search for answers to questions, analyze the text, which in turn contributes to the development of coherent speech.

**Key words:** fairy tale therapy; Belarusian folk tale; children.

**Уводзіны.** У нашым грамадстве з кожным годам павялічваецца колькасць дзяцей, якія маюць парушэнні маўлення. Парушэнні маўлення, якія не былі выпраўлены ў дашкольным узросце, у будучыні могуць выклікаць цяжкасці зносін, што не дазволіць дзецям у поўнай меры раскрыць свае інтэлектуальныя здольнасці, ускладняць іх навучанне ў школе і далейшую сацыялізацыю. Дадзеная праблема падштурхнула да пошуку новых метадаў і прыёмаў эфектыўнай працы для ўдасканалення ўсіх кампанентаў маўленчай сістэмы дзяцей, павышэння іх цікавасці да заняткаў і карэкцыйнага працэсу. Агульнавядомая цікавасць дзяцей дашкольнага ўзросту да казак, таму мы звярнулі ўвагу на такі метад, як казкатэрапія.

**Асноўная частка.** Казка — гэта маленькае жыццё, якое пражывае дзіця, поўнае фарбаў, цудаў і прыгод. У працэсе працы над казкамі адбываецца ўзбагачэнне слоўнікавага запасу, аўтаматызацыя гукаў, а таксама ўвядзенне гэтых гукаў у самастойнае маўленне. У працы над тэкстам казкі дзіця вучыцца пераказваць, прыдумляць, ажыццяўляць пошук адказаў на пытанні, аналізаваць тэкст, што ў сваю чаргу спрыяе развіццю звязнага маўлення [1].

У сувязі з гэтым казкатэрапія з’яўляецца адным з метадаў, які актыўна распрацоўваецца ў апошні час і ўжываецца ў карэкцыйнай працы з дзецьмі, якія маюць розныя парушэнні маўлення.

У навуцы існуе канцэпцыя казкатэрапіі, распрацаваная замежнымі і расійскімі навукоўцамі. Імі падабраны выдатныя лагаказкі, гульні і практыкаванні, заснаваныя на ўзаемадзеянні дзіцяці з казкай, якія шырока выкарыстоўваюцца ў працы з дзецьмі.

На думку О. А. Шорахавай, казкатэрапія — інтэгратыўная дзейнасць, у якой дзеянні ўяўнай сітуацыі звязаныя рэальнымі зносінамі, накіраваныя на актыўнасць, самастойнасць, творчасць, рэгуляванне дзіцем уласных эмацыйных станаў [2].

Казкатэрапія адносіцца да ліку здароўезберагаючых тэхналогій, якія не патрабуюць асаблівых намаганняў, аптымізуюць працэс карэкцыйнай працы, а таксама спрыяюць паляпшэнню стану ўсяго арганізма.

Вылучаюць наступныя элементы казкатэрапіі, якія выкарыстоўваюцца ў лагапедычнай працы з дзецьмі:ператварэнне занятка ў казачны сюжэт, прыцягненне да занятку казачнага героя, ужыванне фрагментаў з казак, прыдумванне казак.

Развіццю такіх кампанентаў маўлення, як тэмп, тэмбр, сіла, інтанацыя, выразнасць, спрыяе драматызацыя казкі.

Казкатэрапія спрыяе аўтаматызацыі і дыферэнцыяцыі гукаў у звязным маўленні дзяцей дашкольнага ўзросту. У дзяцей са складанымі маўленчымі парушэннямі назіраецца ўстойлівасць дэфектаў гука-

© Дрозд В. М., 2021



Репозиторий БарГУ

вымаўлення. Для атрымання ўстойлівага выніку ў працы з такімі дзецьмі неабходны шматлікія паўторы слоў, фраз на пэўныя групы гукаў. Усё гэта з поспехам можна адпрацоўваць у працэсе маўлення і драматызацыі казак, так як у іх вельмі часта выкарыстоўваюцца паўторы. Дзеці з задавальненнем запамінаюць невялікія па аб'ёме ўрыўкі, якія могуць паўтарацца ў працэсе маўлення казак некалькі разоў. Гэта дапамагае дзіцяці наладзіць эмацыйны кантакт і форму маўленчых зносін з дарослымі і са сваімі аднагодкамі.

Таксама метад казкатэрапіі дапамагае павысіць узровень культурнага і маўленчага развіцця дзяцей дашкольнага ўзросту, ажыццяўляючы знаёмства з вобразамі з народных казак, з сусветнага фальклору, з сюжэтамі карцін знакамітых мастакоў, якія ілюстравалі казкі. Сваю працу ў гэтым напрамку ажыццяўлялі таксама на аснове беларускіх народных казак.

Метад казкатэрапіі можна паспяхова ўжываць для прафілактычнай працы як на лексічным, так і на сінтаксічным узроўні. На лексічным узроўні прапануюцца практыкаванні, накіраваныя на ўзбагачэнне якасна і колькасна слоўнікавага запасу (пазнаванне семантыкі новых слоў, засваенне разнастайных лексічных і эмацыйных адценняў значэння слоў, прамога і пераноснага сэнсу асобных слоў і словазлучэнняў). Напрыклад, практыкаванні з выкарыстаннем ілюстрацый да беларускай народнай казкі «Гарошак»: выхавальнік называе прадмет і яго прыкмету, а выхаванцы павінны назваць іншы прадмет з такой прыкметай (булава вялікая, лапці саламяныя, жоўтыя і г. д.); параўнанне знешняга выгляду братоў.

На сінтаксічным узроўні метад казкатэрапіі спрыяе знаёмству выхаванцаў з шматзначнасцю, сінонімамі, антонімы, больш трываламу засваенню сэнсу гэтых моўных з'яў. Напрыклад, практыкаванні з выкарыстаннем беларускай народнай казкі «Верабей і мыш» і ілюстрацый да яе. Выхавальнік прапануе адказаць выхаванцам на пытанні: Дзе жыве верабей? Мыш? Дзе схавала мышка прыпасы на зіму? Дзе зімаваў верабей? Што у мышкі ў норцы, на паліцы, за дзвярыма?

Выдзяляюць прыклады выкарыстання прыёмаў казкатэрапіі.

*Гульня «Кракадзіл»* выкарыстоўваецца для апісання знешняга выгляду героя, яго мімікі, паставы, унутраных якасцяў. Інструкцыя: апішы героя словамі, не называючы яго.

Гарошак: добры, моцны, справядлівы, з вялікай булавой, усіх выратоўвае і г. д.

Змей: злосны, страшны, вялікі, дрэнны і г. д.

Курачка (казка «Як курачка пеўніка ратавала»): смелая, добрая, працавітая і г. д.

Мыш (казка «Верабей і мыш»): хітрая, падманшчыца, сытая і г. д.

*«Рыфмоўкі»* — прыдумаць рыфму, выкарыстоўваючы эпітэты, адпаведныя апісанню казачнай сітуацыі або казачнага героя.

Лісіца — хітрыца, булава — галава, каза — дераза, мышка — скрабушка, муха — пяюха і г. д.

*Аўтаматызацыя гукаў.* Прапануецца назваць словы з пэўным гукам (у пачатку, у канцы, у сярэдзіне слова) пасля праслухвання ўрыўка казкі.

*Падарожжа па казцы.* Можна выкарыстоўваць драматызацыі асобных фрагментаў казкі, пераказ па плане, сціснуты пераказ і г. д.

*Прыдумванне казкі па апорным малюнкам з пачаткам сказа.*

Жылі-былі… І быў (а) у іх… Вось аднойчы… Ідзе ён (а) па дарозе, а на сустрэчу… Кажа… такія словы: «…». Ідзе… далей… Тут сустракаецца яму (ёй)… і пытаецца: «…?» Адказваць..: «…» Ідзе далей, раптам бачыць:.., спалохаўся (лася) і кажа: «…» Ці доўга, ці хутка, але прыйшоў (ла)… А там чаго толькі няма!… Дастаў (а)… Сталі жыць-пажываць ды дабра нажываць…

*Прыдумванне заканчэння вядомай казкі:* весёлага, фантастычнага, сумнага і г. д.

Змяніць сюжэт казкі «Пра быка і яго сяброў», каб героі казкі пасябравалі і будавалі дом, збіралі запасы на зіму разам, а не паасобку, каб ніхто не пужаў быка. Каб мядзведзь пасябраваў з жыхарамі дома і не лічыў іх разбойнікамі. Змяніць сюжэт казкі «Пшанічны каласок», каб індык і гусак не былі гультаямі, дапамагалі курачцы малаціць зерне, малоць муку, глядзець дзетак, пакуль яна пячэ булкі, а ў канцы казкі разам пілі гарбату з булкамі.

*Уключэнне ў сюжэт казкі героя з іншай казкі.*

*Гульня «Складзі казку».* Выхаванцам прапануецца восем картак з сімваламі, якія маюць пэўнае значэнне. Да іх падабраны восем кубікаў-падказак з выявамі розных прадметаў, герояў, дзеянняў, эмоцый і пачуццяў. На першым этапе выхавальнік прапануе чатыры карткі з сімваламі, а дзеці з дапамогай кубікаў-падказак складаюць казку. Затым колькасць картак павялічваецца да шасці і васьмі. На другім этапе выхаванцы самастойна выкладваюць карткі з сімваламі і падбіраюць кубікі, а затым складаюць казку. Спачатку выханцы пачынаюць з чатырох картак, потым іх колькасць павялічваецца.

**Заключэнне.** У атмасферы казкі дзеці становяцца больш адкрытымі да ўспрымання рэчаіснасці, праяўляюць вялікую зацікаўленасць у выкананні розных заданняў. Прымяненне казкатэрапіі ў працы спрыяе таму, што ў выхаванцаў знікаюць перажыванні, звязаныя з дэфектамі маўлення, паляпшаецца псіхічны стан, што, у сваю чаргу, станоўча ўплывае на іх сацыяльную адаптацыю. Выкарыстанне метаду казкатэрапіі прыводзіць да станоўчай дынамікі ў маўленчым развіцці і эмацыйна-валявой сферы; паляпшаецца фанематычнае ўспрыманне, артыкуляцыйная маторыка, гукавымаўленне, слогавая структура слова, моўны аналіз, граматычны лад, лексіка, лексіка-граматычныя адносіны, а таксама звязнае маўленне.

**Спіс цытаваных крыніц**

1. *Зинкевич-Евстигнеева, Т. Д.* Практикум по сказкотерапии / Т. Д. Зинкевич-Евстигнеева. — СПб. : Речь, 2000. — 310 с.
2. *Зинкевич-Евстигнеева, Т. Д.* Путь к волшебству. Теория и практика сказкотерапии / Т. Д. Зинкевич-Евстигнеева. — СПб. : Златоуст, 1998. — 352 с.
3. *Шорохова, О. А.* Играем в сказку / О. А. Шорохова. — М. : Сфера, 2006. — 298 с.



Рэпазіторый БарДУ